БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поўдня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права направляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаўкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—60 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 56. Менск. Субота 1 чэрвеня 1918 г. Год I

Абвестка.

Абмежаваная лічба прадуктаў прымушае нас як можна больш скараціць гандаль ў сталоўках і рэстарацыях.

Праз гэто ўсе сталоўкі, рэстарацыі і гарбатні, а так сама рэстарацыі пры тэатрах і кабарэ ў будучым павінны быць зачынены тры дні ў тыдзень, а ласьне: па панядзелках, чацьвергах і суботах.

Пытаннэ аб тым ці есьць патрэбнасьць пакінуць адчыненымі некольki рэстарацыяў i ў названыя вышэй дне, будзе вырашано граданачальствам, аб чым будзе абвешчано ў тутэйшых газэтах.

Менск 31 мая 1918 р.

Комэндант
фон-ФРАНКЕНБЭРГ.
Палкоўнік.

Тры цэнтры.

У цяперашні момэнт есьць у Беларускай справе тры глаўных цэнтры, з якіх кожан па свойму працуе на карысьць Бацькаўшчыны.

Першы цэнтр—Вільня, старая традыцыйная сталіца Беларуска-Літоўскага князства, ужо другое дзесяцілецце кузьня нашай нацыянальнай культуры. Там ад 1905 году цэнтраваліся найлепшыя беларускія інтэлігэнтныя сілы; выдаваліся газэты, кнігі—адтуль велася сталая прапаганда беларускай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі. За час вайны, ад пачатку окупацыі немцамі часьці Беларусі, тамака справа беларускай культуры зрабіла вялікі крок упярод,—заснавалася настаўніцкая сэмінарыя, цаложаны пачатак школьнай беларускай сеці арганізацыяй каля 200 народных школаў, выдано шмат школьных падручнікаў.

Там нашыя перадавыя людзі, з выразнай тэндэнцыяй да здабыткаў захадняй культуры і з нямецкай палітычнай орыентацыяй робяць самую рэяльную работу—выпускаючы што год некольki тысячаў нацыянальна-асьвядомленых дзяцей беларусаў, ад якіх і бацькі набіраюцца новых асьвежаючых думак.

Школы—гэта карэння, варстаты нацыянальнага духа,—кожнага народу.

Другі цэнтр Менск—пры расейшай рэакцыі і чорнасоценным панстве, ні мог да перавароту нічого выразнаго стварыць, тым болей, што ад пачатку вайны тут былі прыпынены расійскім ваенным урадам нават беларускія часопісі. Ад пачатку пераваротy Менск адваеувае сабе значэнне палітычнаго цэнтру, з якога ідзець уся работа па злучэнню разарванай Беларусі і адваеванню для яе дзяржаўных правоў. Шмат перашкаджало гэтай рабоце існаванне двух палітычных орыентацыяў: беларускай, каторая над усе ставіла інтарэсы Беларусі і москвофільскай, каторая стаяла на группе расійскаго «областничества».

З заняцьцем Менску нямецкім войскам, яго значэнне як палітычнаго цэнтру ні зменьшылося, але наадварот зрабілося больш[ым]. Людзі на Віцебшчыне і Магілеўшчыне у Смаленшчыне і раскіданыя па беларускіх калоніях у Расіі зьвертаюць свой пагляд сюды і ад Рады Рэспублікі у поўным зауфанні чакаюць сабе парады і паратунку.

Трэцяму цэнтру пачатак палажыў Вялікарускі урад. Бажаючы адарваць ад Рады часьці Беларусі, якія іщчэ знаходзяцца пад яго уладаю ен стварыў «Беларускі нацыянальны камісарыят» куды заманіў беларусаў большэвіцкаго нахілу. Ім дапамагаць узяліся тыя беларусы—москвофілы, якія выехалі з Менску пасьля уцеку адсюль большэвікоў і прыходу немцаў.

«Камісарыят» безсільны і ні здольны зрабіць што нібудзь у палітычным значэнні, споўняе аднак ролю новаго культурнаго цэнтру, выдаючы на атрымоуваныя ад большэвіцкаго ураду газэту, у якой «савецкім штілям» лае Раду, Віленскіх і Менскіх дзеячоў, але шырыць ідэю нацыянальнай еднасьці, выдае кнігі па беларуску—літэратурныя і навуковыя працы і школьныя падручнікі.

Так датасоўваючыся да палітычных зьмен ідзе упярод ідэя беларускаго нацыянальнаго адраджэння.

Падзелы Беларусі выклікаюць да жыцця новыя цэнтры, але с паміж іх Менскаму належыць усе значэнне агульна дзяржаўнаго цэнтру.

Я—р.

Агульныя весткі.

КІЕЎ 27-V. У перамовах паміж гэтманом Скорападзкім і украінскай соцыялістычнай партыяй дайшло да пэўнай згоды. Украінскія соцыялісты увайдуць у габінэт, стварэнне якога ўзяў на сябе соцыяліст-фэдэраліст Шульгін, старшыня украінскай дэлегацыі у мірных умовах з Расіяй.

БЭРЛІН 28-V. Члены былаго царуючаго дому, вялікі князь Петр Мікалаевіч з жаною, сынам і дачкою, вялікі князь Александр Міхайловіч з жаною і 6 дзяцьмі, і ўдава імпэратрыца Марыя Феодороўна, цяперашнім часэм знаходзіцца у маёнтку Дзюльбар пры мысе Айтодор. Вялікая княгіня Вольга і яе маці знаходзіцца у Харасцы, на усходзе ад Дзюльбара. Усе весткі аб уцёках вялікяго князя Мікалая Мікалаевіча былі выдуманы.

ШТОКГОЛЬМ 28-V. Новы склад Фінляндзкага сэнату закончаны. Усе Сэнатары астаюцца па сваіх пастах. Гасударскім міністрам назначаны—Паасіківі, ваенным міністрам—палкоўнік Цеслеў, міністрам заграничных спраў—сэнатар Стэнрот і міністрам без партфэля—Сарыо. У той жа час гаспадарскі радцы Пальгаймо назначаны шэфам харчавога дэпартамэнту.

БЭРЛІН 28-V. Як паведамляе «Nord Allg. Zeitung», агентство «Гавас» аправергае весткі аб тым, што перэрваны дыплёматычныя зносіны паміж Мэксікай і Кубай.

КІЕЎ, 26/V. Рада міністраў выдала распараджэнне, што паводлуг пастановаў аб абработку палёў ад фэльдмаршала Фон-Эйхгорна ад 6 красавіка, жніво палёў абработаных вясною належыць рабочым. Апошні павінен даць гаспадару грашамі або натурай малы падатак паводлуг умоў паміж імі, маючы на ўвазі ураджай жніва або у крайнім выпадку ні больш адной трэцяй часткі звычайнаго ураджаю у гэтай ваколіцы. Так сама ён яму павінен заплаціць за ваенную работу і за налогі і земскія зборы, якія ён павінен плаціць у 1918 г.

БЭРЛІН, 28/V. Французы заўсёды упорна пацьверджалі і даказывалі сьвядоцтвамі вышэйшых каталіцкіх сапоўнікаў, што на башні катэдральнаго сабору у Раймсу ніколі ні было артылерыйскаго дазорнаго паста. Мы цяпер можам казаць імя аднаго французскаго афіцэра, каторы па уласнаму паказанню быў да канца красавіка дазорным афіцэрам на башні сабору у Раймсе. Гэта—французкі артылерыйскі афіцэр. Эдуард Альбэрт дэ Бондэллі, у прыватным жыцці—чыноўнік банка Ліонскі крэдыт.

Весткі з Расіі

Ад аднаго с прыяцелеў нашай часопісі, жывучаго у Вялікарасіі мы атрымалі ліст, у якім характэрызуецца праца «Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту» пры цэнтральным Вялікарускім Урадзе. Дзеля яе агульнай цікавасьці падаем яе без усякіх зьмен:

«З Беларускай справай—як і было. Застаўшыеся часткі Віцебшчыны, Смаленшчыны і г. д. ледзьве ні ўключаюцца ні як фэдэрацыйная частка, а прост у Маскоўскую обласьць. Беларускія Камісары «(*Камісcарыят.» п. Р.*) маўчаць і ківаюць галовамі. Літоўскія і іншыя *імпэрыялісты, хаця і большэвікамі завуцца*, інтрыгуюць у брыдкі спосаб проці „беларусаў і ціснуць беларускіх камісараў, каторыя ні умеюць, ці ні хочуць бараніцца. Літоўцы і латышы дзеля сябе„напр. усё робяць, а калі беларусы хочуць тое самае казаць, дык яны ўсчынаюць гвалт, што гэта нацыяналізм, буржуазыйнасьць і г. д. Нашыя людзі баяцца конфліктаў з уладай і... нічога ні робяць, альбо займаюцца «громаадводнай» работай, каб іх асобам было спакайней і каб выдаваць міну, што нешта робіцца».

— Голад у Расіі пагнаў цэлыя тысячы перасяленцаў у Сыбір. Гарады Зах. Сыбіры перапоўнены уцекачамі ад голаду у Вялікаросіі. Цяпер цэлы рад гарадоў Зах. Сыб. забараніў у сябе ўезд уцекачом з Вялікаросіі. Як вяліка лічба уцекачоў паказуе тое, што Омск за $1^1/_2$ месяца павялічыўся болей чым на 100.000 жыхароў.

Селяне Семіпалацінскай обласьці і селянскі зьезд Омскай (б. Акмалінскай) обл. вынеслі пастанову ні допушчаць ніякаго перасялення у обласьць.

— Характэрнай рысай для істнуючых цяпер у Вялікаросіі парадкаў з'яўляецца вялікая лічба ваенных аддзелаў, на часьці партызанскіх, на часьці створэнных самым дзіўным спосабам. Яны ні гдзе ні зарэгістрованы, ні кім рэгулярна ні надзеляюцца харчамі і усімі патрэбнымі матэр'ялами і каб утрымацца робяць рэквізыцыі, якія часта служаць прычынай ні літасьцівых расправаў з абоіх бакоў. Рэквізыцыі робленыя імі без усякай сыстэмы часамі даводзяць да голаду бедныя провіянтам районы, у той час, як побач ёсьць лішкі і тым ні даюць харчовым арганізацыям праправаць.

У Курску, Брянску, Арле

нікаторыя аддзелы удалося ліквідавадь Апрача самавольных рэквізыцыяў, якія часамі пераходзяць проста у грабежства з разбоям, гэтыя аддзелы з'яўляюцца заўсёднай прыгрозай местовым «саветам», бо прызвычаеныя да самавольства ні церпяць над сабой ні якай улады.

— Ды і органы гэтай апошняй ні карыстаюцца ушанаваннем нават у работніцкіх і селянскіх масах. Прычына — ні суменнасьць. За апошнія часы расійскія газэты перапоўнены звесткамі аб судах і расправах над членамі «совдепау»; «ісполкомаў» за кражу грамадзкаго меныя, хабары, насільства.

— Так ласкава асьвядаміла нас прыехаўшая на гэтых днёх асоба, каторай давялося набываць у цэнтральнай Расіі.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Харчовым кооперацыуным бюро пры управленні Л. Р. ж. д. заарэндовано каля ст. Менск Александроускай ж. д. 20 дзес. прыватнай зямлі, на якой для патрэб жалезнякоу пасеялі—бульбу, моркау, капусту, фасоль і др. агароднiны. Гэто каштавало каля 7000 руб.

Так-сама зрабіло і афіцэрскае бюро, заарэндаваушы для сваіх патрэб у загародным фольварку Э. Амброшкевіча кавалак зямлі.

Дзеля тавараобмена з Менскам, як паведамляюць сталічныя газэты, пасьля перэгавогау Ратнера з Маскоускім камісарыятам таргова-прамысловасьці аб дазволу вывазу з Масквы праз Оршу для мінчан мануфактуры, галош, нітак, кавы, какао, мыла, скур і др., мейсцам абмена прадуктау назначаны вакзал Менск.

Выдача бонавымі крамамі хлебнаго пайка за 29 і 30 мая зноу стармазілася: па большасьці хлеба ні хапало, выключаючы спэцыяльных меськіх крам.

Прыезд у Менск с Пецярбургу епіскапа р.-к. епархіі Лозынскаго, якога з ніцерплівасьцю чакаюць каталікі, пакуль што, дзеля фармальных прычын, на некольки часу адкладываецца.

Афіцэрскае бюро падняло пытанне аб адчыненні коопэратыва ваенна-служачых і майстэрні дзіцячых і дамскіх вопратак са школай кройкі.

«Камітэт служачых работнікау В. З. С. К. З. Ф.», апошнімі часамі істнуючы у асобе аднаго толькі Рэшэтова, як земсаюзнаго «прэзыдэнта», цяпер распауся: Рэшэтоу выезжае у Маскву у цэнтр. камітэт В. З. С. адчытывацца за увесь час свае «вялікай» дзеяльнасьці.

Мабыць, у хуткім часе і можна будзе над камітэтам В. З. С. К. З. Ф. пастазіць магільны крыж—дауно пара!

На Троіцкім пляцу у сераду, 29 мая, і учора, 31 мая, былі вось якія цэны:

Дровы — 16—25 р. воз.
Малако (кіслае) 1 р. кв.
Яйкі— — $3\frac{1}{2}$—4 р. дзес.
Сыр-- — 10—12 р. шт.

Рэгістрацыя афіцэрау, урачэй і ваенных чыноунікау закончылася учора, 31 мая.

Ад гэтаго дня, г. з. ад 1 чэрвеня, касуецца іх паек і пэнсія, апрача уражэнцау Менска і уражэнцау зноу акупаваных вобласьцеу, запісаушыхся на выезд, але ні выехаушых дзеля чэкання свайго эшалону.

Для такіх выдача пайка і пэнсіі прадоужана і на чэрвень месяц

Вакантныя мейсцы двух членау управы, стварыушы сярод думцау яркую тэму дня, нэрвіруе іх з-за двух прычын: першая—яшчэ ні пастаулены выбар на партыйных, ці ніпартыйных кандыдатау, другая — окупацыйныя уласьці растлумачылі, што выбраннікі павінны быць пацьверджаны граданачальствам.

У губ. Казначэйстві да дня выплаты сумм казенным установам г. з. на 1-ае чэрвеня па трэбавацельным ведамасьцям на пэнсію, сказан дэфіцыт на 60,000 р. есьць усяго—100,000 р.

На звертанне у нямецкую меняльную краму аб выручцы па прыкладу мінулаго месяца, пакуль што німа адвету.

Хаця на днях можа быць унесено да 100,000 руб. губ. акцызным управленнем, так званых, акцызных зборау.

Беларускі тэатр.

Сягоння, 1-го чэрвеня, у Беларускім Народным Доме імяні Максіма Богдановіча ставіцца у першы раз новая пьеса Ф. Олехновіча у двух дзеях «Каліська».

Еурэйская абшчына. Першае пасядзэнне Менскай еурэйскай абшчыны ні адбылося дзеля прычын чыста тэхнічных. У абшчыне як усюды, пануюць партыйныя нілады. Адпаведныя кругі абшчыны цяпер заняты пытаннем аб легалізацыі яе, тады толькі яна можа быць правамоцным органам еурэйскаго насялення усяго краю. Дзеля консолідацыі абшчыны павінен быць стварораны хаурус усіх еурэйскіх абшчын Беларусі.

Першае пытанне абшчыны —гэта фінансавае, шуканне грошай на пакрыцце маючаго быць вялікаго бюджэту абшчыны. Прапануецца увесьці падаходна—прагрэсіуны налог. Другое пытанне—школьнае. Трацяе пытанне—гэта беднае становішчо уцекачоу і развал еурэйскаго камітэту помачы ахвярам вайны, прыпыненне помачы с Пецярбургу ставіць перад абшчынай ніадкладную патрэбнасьць арганізацыі помачы уцекачам, адпраукі іх у родныя мейсцы і г. д.

Вось бліжэйшыя пэрспэктывы, мэты і заданні працы абшчыны.

Меськая харчовая камісія прапануе усім адказаушымся ад бон, дастаіць к 3 чэрвеню згодна распараджэння нямецкіх уласьцей, весткі: а) у якім павеці знаходзіцца маентак, з якога яны будуць атрымоуваць прадукты, б) калі у Менску то у межах места, ці за яго межамі.

Весткі павінны быць дастаулены у кантрольны аддзел меськаго харчавога камітэту, дзеля замены на сьвядэцтвы за нямецкай печаццю.

Курсы беларусазнаўства.

1 чэрвеня лекцыя Я. Варонкі «Беларусь і яе суседзі» (Беларусь і Украіна).

Пачатак а 7 гадз.

Літэратура і штукарство.

Па ініцыятыве Народнаго Сэкрэтара Асьветы А. А. Смоліча, Народны Сэкрэтарыят пастанавіу выдаць кнігу вершау паэта Алеся Гаруна— „Матчын дар", Якуба Коласа —„Песьні жальбы", Новы беларускі буквар—(граматку) А. С., літэратурны зборнік навейшай беларускай літэратуры. Кніга «Матчын дар» і яшчэ адно выданне Сэкрэтарыяту— праваслауны малітвеннік ужо паданы у друк.

У хуткім часе мае выйсьці з друку у выданні „Т-ва Беларускай Культуры" кніжка для дзяцей—«Дзіцячая чытанка».

На беларускую мову пералaжана М. Косьцевічам пьеса Максіма Горкаго—«На дне».

Р. Земкевічам пераложэна на беларускую мову драма Л. Толстого—«Уласьць цемры».

Весткі с краю.

Даугінаво, Вялейскаго павету,— досьць вялікае мястэчка. Большая палавіна мястэчко, самы сяродак выгарэў, ад ваеннаго бою у 1915 году. Цяпер вачынаюць пагарэльцы адбудовывацца. Ды ні хват муляроў, печнікаў, пільшчыкаў, і іншых майстроў. Маладзёжы навокал шмат ёсьць, але у войску праз чатыры гады павучыліся дзяцюкі толькі лынды абіваць, значыцца—марнаваць час. Цэглы на гвалт шмат каму трэба, а дастаць нейдзя. Ніхайбы хаўрусом зложылі людзі грошы і заложыліб складковую цагельню. Дошкі тут людзям страшэнна патрэбны, а пільшчыкі дорага баруць—да 2 рб. шнур трохсажнёвы. Каб так дагадаліся людзі зложыцца компаніяй і зрабіць складчыну на тартак — тожбы мелі заработак добры і карысьць добрая людзям былаб.

Абсеіцца сёліта удалося, а насеўкам ні трудна было. На Шосніка прадавалася тут на кірмашы бульба па 4 рублі пуд, а пад канец дня дык і па 3 р., а шмат хто навёз дамоў ні прадаўшы. Жыта было па 30 р. пуд. А цяпер усё падаражэло, бо зьявіліся купцы з-за пазыцыі: с пад Пастава, са Свірскай валасьці і далейшыя бедакі.

У валасной канцэлярыі німа ведама што рабіць. Было сказана выбіраць старшыню— па стараму, пасьля было сказана выбраць валасного начальніка, а людзям найлепей —каб ў валасьці было так як і у Меншчыне, ёсьць,—гэта валасное земство і валасная земская управа.

А. Б.

— **Паварот архіепіскопа Ціхана.** Як піша «Lietuvos Aidas», у Коўні адбівае каранцін праваслаўны архіепіскоп Ціхан, каторы варочаецца з Расіі назад у Вільню разам с шэсьцьма манахамі. Адбыўшы каранцін, ён мяніцца жыць у Трынопалі, над Вільняй.

Смаленшчына. Як мы даведаліся з расійскіх газэт, у Смаленскай губэрні і у ніакупованых паветах Менскай і Магілёўскай губэрні ні вельмі слухаюць загадаў старшыні 24 паветаў «Заходняй обласьці» Самовера. Ён жаліцца на падатную інспэкцыю, якая зусім ні спаганяець налогаў ад прыватных асобаў.

Ад заходняго фронта Заходняй обласьці дасталося 12 мільёнаў руб. каторыя ужо даўно вырасходаваны.

Мейсцовыя совдэпы маняцца правесьці прагрэсіўны падаходны налог, пры мінімуме аблажэння у 1000 рублёў, каб такім чынам вынампаваць грошай з вёскі. Гэты налог павінен даць каля 30 мільёнаў руб.

За «саботаж» інспэктар падатной інспэкцыі мае быць адданы над суд.

Так сама ні надчыняецца большэвіцкай тамтэйшай уладзе упраўляючы Смаленскай скарбовай палаты.

м. Койданоў.

Койданоўская Беларуская Рада адной з сваіх бліжэйшых мэтаў паставіла культурна-нацыянальную працу. Дзеля падмогі у гэтым Рада арганізуе бібліотэку. Каб навялічыць фундуш бібліотэкі нікаторыя з сяброў Рады надумаліся уладзіць беларускую тэатральную выставу, тым болей, што тэатр і сам праз сябе ёсьць моцным аружжам нацыянальнай працы—ў справе пашырэння і углыблення сьвядомасьці. Знойдзены былі людзі, каторыя ахвотна узяліся дапамагчы сябром Рады і вось 6 мая г. г. у нашым мястэчку адбыўся беларускі тэатр і вечар па такой праграме:

1) «Ні розумам сьцяміў, а сэрцам», пьеса К. Вясёлаго, 2) «Па рэвізыі»—перакладкам. у 1 дзеі Крапіўніцкаго, 3) аркестра балалаечнікаў, выканаўшая паміж іншым і нікаторыя беларускія мотывы і 4) танцы, с усякімі звычайнымі гуляннямі: лят. почтай і г. і.

Білеты на выставу былі выпраданы усе і шмат ахвотнікаў пазнаёміцца з беларускай штукай ні маглі папасьці у тэатр. За тое, папаўшыя асталіся здаволены выставаю.

Сцэнічныя рэчы удаліся як найлепей,—хаця-б і для большаго гораду, чым Койданоў.

Удача выставы і глаўным чынам ідэйны усьпех паказалі участнікам, якім вялікім аружжам нацыянальнай сьвядомасьці яўляецца тэатр, выклікаючы нацыянальнае пачуцце у людзей і прабуджаючы у іх любоў да роднаго жыцця і роднай мовы.

Койданоускі.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоўнаго камандавання за 30 мая 1918 року.

З А Х А Д: На баевых фронтах між Ізэрам і Уазаю баевая чыннасьць часта ажыўлялася. Былі мейсцовыя пяхотныя бае.

Націск баевых арміяў Нямецкаго Кронпрынца пабеданосна працягваецца.

Паўночней Эн была захоплена праз упартыя бае мейсцовасьць каля Крэсі-ан-Мон, Цювіньі і Кюффі. Брандэнбургскія войскі ўзялі Суассон. Паўдневей Вэль быў перарваны нова-створаны францускі фронт, ніўстрымнымі націскамі нашых дывізыяў. Мы адкінулі ніпрыяцеля пасьля заўзятаго супраціўлення да лініі Віллямонтуар—Фэран—Тардемуа—Кулхнь—Бруйе—Бранкур.

Форты паўночна-заходней Раймсу ўпалі. Паўночная частка Ля-Невільмотт і Бетэні былі ўзяты.

Лічба палонных перавышае 35000. Здабытак артылерыі і снараджэння колосальны, былі захоплены рознаго гатунку пушкі аж да самых цяжкіх калібраў. Ніўстрымны рух нашых атак. войскаў ні даў магчымасьці ніпрыяцелю увезьці свае колосальныя запасы, што знаходзяцца ў заваеванай намі обласьці, вялікія склады перайшлі ў нашыя рукі ў Суассоні, Брэнь і Фім. Вагромныя склады снарадаў, поезды, лазарэты с многалічнымі прыладамі былі забраны намі.

У вайсковых групах гэрцога Альбрэхта і Гальвіца баевая чыннасьць ажыўлялася толькі часамі.

Нашыя лятуны, скінулі за апошнія тры дні 38 варожых аэропланаў. Обэр-лейтэнант Бэртольд здабыў сваю 29 надзёмную перамогу, лейтэнант Рот зьбіў ў часе налету ад Дзіксмюда да Іпэрна 5 прычэпных балёнаў.

Перты-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Вячэрні адчот:

Паўдневей Фэр-ан-Тардэнуа мы падходзім з боем да Марны.

Бюро Вольфа.

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтва Т-во «Заранка».

Друкарня Я. А. Грынблята.